УДК 930.85:[726.8:26–4](476)

# ГАБРЭЙСКІЯ МОГІЛКІ БЕЛАРУСІ ЯК АБ'ЕКТ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

***В. А. Бруевіч,*** *магістрант кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», каардынатар музейных праграм Саюза беларускіх габрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын*

**Анатацыя.** У артыкуле габрэйскія могілкі Беларусі разглядаюцца як артэфакты культуры. Увага акцэнтуецца на тым, што, пражываючы ў славянскай сацыякультурнай прасторы, габрэі захавалі свае этнічныя адметнасці, якія ўвасобіліся ў пахавальнай культуры. Аналізуецца стан захаванасці пахаванняў, падыходы і перспектывы разумення габрэйскіх могілак Беларусі як аб'екта культурнай спадчыны краіны і важнага элемента агульнай транснацыянальнай спадчыны. Вызначаюцца магчымыя шляхі актуалізацыі гэтай спадчыны.

**Ключавыя словы:** культурная спадчына, актуалізацыя спадчыны, захаванне спадчыны, габрэі, могілкі.

# THE JEWISH CEMETERY OF BELARUS AS AN OBJECT OF CULTURAL HERITAGE

**V. Bruyevich,** *Master's Student of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts», Coordinator of Museum Programs of the Union of Belarusian Jewish Public Associations and Communities*

**Abstract.** The article explores the Jewish cemeteries of Belarus as cultural artifacts. Emphasis is placed on the fact that, living in the Slavic sociocultural space, the Jews preserved their ethnic characteristics, which were embodied in the funeral culture. The article analyzes the state of preservation of burials, approaches and prospects in understanding the Jewish cemetery of Belarus as an object of the country's cultural heritage and as an important element of transnational heritage. The author determines the possible actualizational ways of this heritage.

**Keywords:** cultural heritage, actualization of heritage, heritage preservation, Jews, cemeteries.

Першыя дакументальна зафіксаваныя звесткі аб прысутнасці габрэяў на тэрыторыі Беларусі адносяцца да часоў вялікага князя Вітаўта і звязаны са з'яўленнем габрэйскіх абшчын у Брэсце (1388) і Гродна (1389) [1, с. 15]. Паступовае рассяленне габрэяў на беларускіх землях сфарміравала ўнікальны пласт непаўторнай культуры і традыцый, што адпаведным чынам зафіксавалася ў матэрыяльнай і духоўнай спадчыне краіны.

Пачынаючы з другой паловы XX ст. аб'екты габрэйскай культуры ўсё часцей разглядаюцца і прызнаюцца міжнароднай супольнасцю як важны элемент агульнай транснацыянальнай спадчыны. Сярод такіх аб'ектаў пераважаюць габрэйскія могілкі альбо іх рэшткі, якія нярэдка з'яўляюцца апошнім напамінам аб габрэйскай прысутнасці на беларускіх землях. Невыпадкова сучаснае грамадства надае вялікую ўвагу вывучэнню габрэйскіх могілак, разглядае іх як важную частку працэсу па актуалізацыі спадчыны і яе трансляцыі будучым пакаленням.

Але ці магчыма назваць габрэйскія пахаванні аб'ектам культурнай спадчыны? Як вядома, пасля прыняцця Канвенцыі ЮНЕСКА ў 1970-х гг. тэма культурнай спадчыны стала папулярна як ніколі раней [2]. Кожная краіна пачала непакоіцца пра свае культурныя каштоўнасці і фарміраваць не толькі ўнутранні імідж, але і будаваць вобраз дзяржавы на міжнароднай арэне.

Спадчына габрэяў у прыватнасці атрымала прызнанне як частка агульнай культурна-гістарычнай спадчыны. Часткова гэта тлумачыцца тым, што спадчына звязана з нацыянальнай палітыкай. Хіба толькі помнікі рымскай ці грэцкай гісторыі можна лічыць агульнаеўрапейскай спадчынай, што не скажаш пра спадчыну культурных меншасцяў, якая не належыць дамінуючай нацыянальнай ці этнічнай культурнай групе рэгіёна, толькі часткова дакументуецца, захоўваецца, не экспануецца і рэдка папулярызуецца.

Гэта тэндэнцыя пастулова змяняецца пачынаючы з другой паловы XX ст., вялікія зрухі заўважныя ў апошнія дзесяцігоддзі. Габрэйская спадчына ўсё часцей разглядаецца і прызнаецца важным элементам, а яе ўсеагульнае прызнанне аб'ектам культурнай спадчыны адкрывае шмат магчымасцей для сферы культуры, адукацыі і эканомікі.

Апошнія пяць гадоў краіны Еўропы займаюцца пошукам новых перспектыў у разуменні спадчыны і тым, як зрабіць яе больш значнай для грамадскасці. На дадзены момант існуе думка, што само грамадства надае значнасць і вагу аб'ектам культурнай спадчыны. Без мясцовых жыхароў і наведвальнікаў, для якіх аб'ект мае сэнс, ні адна гістарычная пабудова, помнік ці старажытны горад не захавае сваю каштоўнасць і прывабнасць [3].

Згодна ранейшым падыходам увага звярталася на фізічныя аспекты, што непазбежна прыводзіла да перавагі ў бок больш яскравых помнікаў. Нядаўні рух у бок «другасных» аб'ектаў з'яўляецца вынікам крытычнага падыходу да вызначэння спадчыны. Крытыка спадчыны – гэта дысцыпліна, у аснове якой ляжыць прызнанне, што не толькі эксперты і ўлада маюць права голасу ў вызначэнні аб'ектаў спадчыны, а таксама і прыватныя ініцыятывы і мясцовыя супольнасці [5].

Як прыклад можна прывесці дзейнасці Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (далей Таварыства аховы помнікаў), якое займаецца габрэйскімі пахаваннямі на тэрыторыі Беларусі.

Таварыствам быў распачаты буйны праект па кансервацыі і папулярызацыя могілак на тэрыторыі в. Ленін Жыткавіцкага раёна, якія лічацца пярлінай могілкавай спадчыны, бо гэта адзіныя пахаванні, дзе дагэтуль захаваліся драўляныя мацэвы (надмагіллі). Гэта другое пахаванне такога тыпу ва ўсёй Еўропе. Штогод таварыства ладзіць летнікі па прыбіранню пахаванняў, заклікае мясцовае грамадства да больш пільнага стаўлення да лакальнай спадчыны, праводзіць дні памяці, таксама плануе ўсталяванне інфармацыйных шыльд, стварэнне лапідарыя і г. д.

Аналагічная сітуацыя з могілкамі мястэчка Ізабелін на Ваўкавышчыне, якімі таксама займаецца Таварыства аховы помнікаў. Але сітуацыя з пахаваннямі значна лепшая дзякуючы мясцоваму насельніцтву, якое разумее ўнікальны культурны кантэкст, які склаўся цягам стагоддзяў, і спрабуе захаваць яго, ладзячы талаку некалькі разоў на год.

Такім чынам, варта канцэнтраваць увагу на грамадскіх ініцыятывах і дапамозе мясцовых жыхароў, падтрымліваць іх удзел у прызнанні і захаванні аб’ектаў. На жаль, сёння шматлікія габрэйскія могілкі нават не маюць статуса пахаванняў. Пры падрабязным разглядзе стану захаванасці габрэйскіх могілак атрымліваецца наступная карціна: 73 з 401 выяўленага пахавання можна лічыць ахоўнымі, яны не патрабуюць тэрміновых работ па аднаўленні, і з іх толькі гістарычная частка габрэйскіх могілак у Магілёве атрымала статус «гісторыка-мемарыяльнага месца пахавання». Паводле даследавання, праведзенага ў Беларусі ESJF (Еўрапейскай ініцыятывай па габрэйскіх могілках), 67 могілак апынуліся пад тэрміновай і непасрэднай пагрозай знікнення, 49 – знішчаны і не адноўлены, 23 – цалкам страчаны [4].

У выніку абыякавага стаўлення да габрэйскіх могілак як аб’ектаў культурнай спадчыны амаль палова існуючых пахаванняў знаходзіцца ў заняпадным стане. Да найбольш сумных прыкладаў можна аднесці сітуацыю ў г. п. Лынтупы, аг. Будслаў, г. Быхаў, аг. Грозава і інш., дзе могілкі фактычна не прыбіраюцца, а надмагіллі раскрадаюцца пад гаспадарчыя патрэбы. Большая частка габрэйскіх пахаванняў не ахоўваецца, а часам невядомыя нават мясцовым жыхарам. Намаганні ў пераасэнсаванні працы з такімі аб’ектамі дапаможа шматлікім людзям паглядзець на сваё мінулае з іншай кропкі зору і адкрые новыя магчымасці для вывучэння і актуалізацыі мясцовай спадчыны.

Пры распрацоўцы планаў па ахове і прыцягненню наведвальнікаў могілак варта пастарацца ацаніць іх каштоўнасць для мясцовай культуры, прасачыць іх гісторыі і асаблівасці мясцін, дзе яны знаходзяцца. Іншымі словамі, ставіцца да могілак як да аб’екта матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны. Больш за тое, трэба пазбягаць разгляду пахаванняў як асобнага аб’екту, а лепей спрабаваць размясціць іх у кантэксце іншых аб’ектаў габрэйскай і негабрэйскай спадчыны, успрымаць як частку цэласнай сістэмы культурнай спадчыны.

Неабходна вывучаць не толькі заключэнні экспертаў, чаму аб’ект культурнай спадчыны важны і ўнікальны, а таксама ў чым яго каштоўнасць для тых, хто намагаецца яго захаваць, рабіць акцэнт на прыцягненні мясцовых жыхароў да працы па ахове і захаванню аб’ектаў спадчыны ў супраца з зацікаўленымі бакамі.

Падсумаваўшы ўсе сказанае вышэй, можна прыйсці да высновы, што праз габрэйскія пахаванні транслюецца непаўторная самабытнасць культуры і гісторыі Беларусі. Вельмі важна захаваць дадзеную шматграннасць з дапамогай дзяржаўных і прыватных ініцыятыў, выкарыстоўваючы розныя стродкі – ад адукацыі да турызму. Усеагульнае прызнанне габрэйскіх помнікаў аб’ектам культурнай спадчыны дае шмат магчымасцей як для самой краіны, так і для міжнароднага супрацоўніцтва. Сітуацыя, якая склалася вокол пахавальнай культуры габрэяў Беларусі, патрабуе міждысцыплінарнага падыходу з мэтай найбольш эфектыўнага выкарыстання іх як аб’екта культурнай спадчыны Беларусі, а не эксклюзіўна габрэйскага мінулага. Гісторыя габрэяў Беларусі неад’емная ад гісторыі самой краіны, таму патрабуе ўключэння ў сучасныя працэсы.

*1. Иоффе, Э. Г.* Страницы истории евреев Беларуси: краткий научно-популярный очерк / Э. Г. Иоффе. – Минск : АРТИ-ФЕКС, 1996. – 255 с.

*2.* Конвенция об охране нематериального культурного наследия [Электронный ресурс] : принята 17 окт. 2003 г. Генеральной конф. Орг. Объед. Наций по вопр. образования, науки и культуры / Орг. Объед. Наций. – Режим доступа: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/cultural_heritage_conv.shtml. – Дата доступа: 11.09.2022.

*3. Стурейко, С.* Кризис сохранения еврейского наследия в Беларуси [Электронный ресурс] / С. Стурейко // Цайтшрифт : журн. по изучению евр. истории, демографии и экономики, лит., языка и этнографии / глав. ред. Д. Шевелев ; Европ. гуманитарный ун-т ; Центр евр. исслед. – Вильнюс, 2021. – Т. 8(13). – С. 281–288. – Режим доступа: https://ru.ehu.lt/wp-content/uploads/2017/10/egu2021_final_opt.pdf. – Дата доступа: 09.09.2022.

*4.* Belarus Jewish Cemeteries Survey and Research Project Report [Electronic resource] // European Jewish Cemeteries Initiative. – Minsk, 2017. – 65 p. – Mode of access: https://www.esjf-cemeteries.org/wp-content/uploads/2019/06/book7_read.compressed.pdf. – Date of access: 10.09.2022.

*5.* Odkrywanie cmentarza żydowskiego [Electronic resource] : podręcznik ESJF / European Jewish Cemeteries Initiative. – 2020. – 84 s. – Mode of access: https://e.issuu.com/embed.html? backgroundColor=%23824&backgroundColorFullscreen=%23824&d=jewish_cemeteries_in_the_classroom__bddb3546cbf507&hideIssuuLogo=true&showOtherPublicationsAsSuggestions=true&u=esjf. – Date of access: 11.09.2022.